**Зімніцкі А. А.**

# ПЕРШЫЯ ФАКТЫ ВЫКАРЫСТАННЯ АРТЫЛЕРЫІ ТЭЎТОНСКІМ ОРДЭНАМ І ВЯЛІКІМ КНЯСТВАМ ЛІТОЎСКІМ У 1381–1382 ГГ.: АНАЛІЗ КРЫНІЦ

Перыяд канца 70-х першай паловы 80-х гг. XIV ст. у гісторыі ВКЛ у пэўным сэнсе можна назваць "выбуховым". Пасля больш чым трыццаці год узгодненага і досыць эфектыўнага валадарання братоў Альгерда і Кейстута ў дзяржаве выбухнула міжусобіца. Барацьба за ўладу паміж сынам Альгерда Ягайлам, з аднаго боку, і Кейстутам з Вітаўтам, з другога, прывяла да шматлікіх крывавых бітваў, эканамічных страт і актыўнага ўмяшання Тэўтонскага ордэна ва ўнутраныя справы літвы. Калі адкінуць у бок метафарычныя выслоўі, то можна адзначыць, што ў той жа перыяд на літоўска-ордэнскім памежжы прагучалі і больш рэальныя выбухі – выбухі ад першых артылерыйскіх стрэлаў.

**Аблога замка Наваполле (*Neunpilen /Nawpil*) войскамі Тэўтонскага ордэна.**

Пад 1381 г. у "Торнскіх аналах" (*Annalista Thorunensis*) мы знаходзім згадку (тут і далей перакладзена на беларскую мову і **вылучана** аўтарам. Усе геаграфічныя і асабістыя назвы і імёны (акрамя агульнапрынятых) транслітэруюцца згодна з іх расшыфроўкай у апублікаваных нарратывах, на якія спасылаецца аўтар артыкула. У дужках прыведзеныя варыянты арыгінальнага напісання на мове крыніцы):

"…11 лютага нашы рыцары прыбылі ў Літву і 13-га, **з вялікімі гарматамі** (***cum magnis pixidibus***), аблажылі замак Наваполле, так што літва, спужаўшыся, здала яго і здалася сама са сваёй маёмасцю – у гэтым замка было каля 3000 чалавек абоіх палоў, і яшчэ адзін замак Дарсунішкі (*Dirsunenhusen*), з якога людзі сышлі, напужаныя штурмам папярэдняга замка, і спалілі яго гэтак жа, як і замак Наваполле. У Прусіі тады не было ні князёў, ні знатных баронаў, але было толькі шмат гасцей" [11, s. 115-116; 7].

Больш дакладна рэканструяваць тыя падзеі дазваляе супастаўленне звестак змешчаных у "Торнскіх аналах" з "Новай прускай хронікай" Віганда з Марбурга (*"Chronica nova Prutenica" Wigand von Marburg)* [14, s. 442–445, 448–451] у распараджэнні якога меліся відаць больш падрабязныя крыніцы[14, s.39–40]. Верагодна менавіта гэта разнастайнасць крыніц з розным датаваннем прывяла да таго, што Віганд паведаміў пра дзве аблогі Наваполля ў 1380 і 1381 гг. адпаведна. Фактычна ж гэтыя дзве часткі хронікі, маючы аднолькавую сутнасць, дапаўняюць адна–адну ў сваіх дэталях. Самае істотнае разыходжанне назіраецца толькі ў колькасці палонных (4000/3000 чалавек), аднак апошняя лічба падцвярджаецца афіцыйным данясеннем Вярхоўнага магістра, якое таксама датаванае 1381 г. [10, s. 599; 7].

У лютым 1381 г. па загадзе магістра, брат Куна фон Хаттштайн (*Kun de Hattsteyn)* і вялікі комтур Ротгер фон Элнер (*Rohtgerus de Elner)* з іншымі знатнымі рыцарамі здзейснілі рэйзу на літоўскія землі.

11 лютага яны ўвайшлі ў межы зямлі Вайгова (*Wygow)* рабуючы якую прасоўваліся на ўсход цягам паловы ночы. Пасля адпачынку імі была разрабаваная таксама зямля Леўкішкі (*Lekenisken)*, адкуль атрад рушыў да замка Наваполле. Першым туды дайшоў кавалерыйскі авангард крыжакоў, які за кошт свайго нечаканага з'яўлення забіў многіх у наваколлі замка. Неўзабаве падышла і асноўная частка атрада, якая прыцягнула з сабой **бамбарды (*bombarden/bombardis*)**.

На наступны дзень (13 ці 14 лютага) быў пачаты абстрэл літоўскай цвярдыні. Як сведчаць ордэнскія крыніцы, сам факт наяўнасці гармат і іх выкарыстанне моцна ўразіў абаронцаў: "Шмат язычнікаў спужалася, бо перад гэтым не ўжывалі супраць іх бамбардаў…" [14, s. 444–445] пасля чаго "…язычнікі захацелі скласці зброю, заключыць перамір'е і дамову з маршалам, па якой добравольна аддаліся ў няволю, пакінуўшы замак без бою колькасцю 3000" [14, s. 448–449]. Сам замак быў спалены.

На трэці дзень пасля прыходу да Наваполля (14 ці 15 лютага) войска ўзнялося рана і рушыла далей. Пры выездзе на дарогу кавалерыйскі авангард тэўтонаў сутыкнуўся з літоўскім атрадам, які магчыма ішоў на дапамогу абложаным. Верагодна што бітва была зацятая, і абодва бакі панеслі значныя страты, бо "…шмат засталося забітых" [14, s. 445]. Тое, што крыжакі змаглі прадоўжыць свой пераход да Дарсунішак, якія ляжалі ля Нёману (4 мілі ад Наваполля – каля 31 км.), можа ўказваць на іх перамогу. Аднак у Дарсунішках ужо ведалі пра лёс сваіх суседзяў, таму абаронцы самі падпалілі замак і сышлі ў невядомым накірунку. Агулам рэйза заняла 6 дзён.

Пасля ўдзелу ў гэтым паходзе маркграф Бадэнскі (*marhio de Baden)* атрымаў рыцарскі пояс. Магчыма, што ў гэтай жа выправе, ці на нейкім яе этапе прымалі ўдзел спадары дэ Леке і дэ Евенбург (*domini de Lecke et de Yevenburg),* а таксама магістр Вінрык фон Кніпродэ (*magister Wynricus)*, і яго таварыш Стэфан гаспадар Амена (*Stephanus dominus de Amen*), на што ўказвае Віганд.

Зыходзячы з лакалізацыі згаданых геаграфічных пунктаў, прынятай у апошняй польскамоўнай апрацоўцы хронікі Віганда (пераклад і апрацоўка Славаміра Зоненберга і Крыштафа Квяткоўскага, выданне 2017 г.), можна выказаць меркаванне, што шлях ордэнскага атрада пачынаўся ад Нёмана, альбо ад яго прытока – ракі Стравы, на беразе Нёмана ж паход і скончыўся. Гэта можа

Репозиторий ВГУ

ўказваць на тое, што для аблягчэння транспартыроўкі, да мяжы літоўскіх земляў бамбарды маглі дастаўляцца па замёрзлых рэках, аднак слабым месцам гэтай тэзы заўсёды будзе трываласць лёду. Бліжэйшым ордэнскім замкам, дзе ў той перыяд фіксуецца артылерыя, і адкуль яна магла быць запазычаная для паходу – быў замак Рагнета. Калі абапірацца на гэтае дапушчэнне, то колькасць бамбард пад сценамі Наваполля наўрад ці перавышала 6 ці 7 адзінак – менавіта такая іх колькасць была зафіксаваная ў Рагнеце ў 1379 г. [8, s. 6–8].

Аблогу Наваполля можна лічыць першым дакладна зафіксаваным выпадкам выкарыстання артылерыі войскамі Тэўтонскага ордэна (раннія магчымыя згадкі агнястрэльнай зброі былі разгледжаныя аўтарам у ранейшых артыкулах [3; 4]). Аднак і гэты факт патрабуе ўдакладнення. Сама наяўнасць артылерыі ў арсеналах Ордэна фіксуецца ўжо пад 1374 г. у інвентары замка Лейпе (*Leipe)* [9, s. 25–26]. Магчыма, што праз тры гады пасля гэтага, яна, завуаляваная пад тэрмінам "*huke*", была выкарыстаная супраць Новага замка (*Novum castrum)* у Полацкай зямлі лівонскім войскам [10, s. 113; 1, с. 218-219]. Аднак, калі зыходзіць са ступені дакладнасці звестак, то аблога Наваполля і выкарыстанне там бамбард выглядаюць найбольш пераканаўча.

**Аблога замка Юргенбург (*Jurgenborg)* войскамі ВКЛ.**

У рэчышчы ваеннай інавацыйнасці не адставала ад свайго суперніка і літва. Так у таго ж Віганда, пад 1382 г. змешчана наступнае паведамленне:

"Пасля Вялікадня [6 красавіка 1382 г.] Кейстут **з бамбардамі (*cum bombardis)*** паплыў на караблі ўніз па Нёмане да замка па народнаму называемаму Юргенбург. Пабачыўшы гэта, брат Яханэс фон Пфірт (*Johannes de Pfirt)* са столькімі вітынгамі, колькі маглі змясціць дзве ладдзі, змусіў да ўцёкаў прыбываючых язычнікаў. І забіў шмат, а 60 захапіў у няволю. Комтур замка, брат Яханэс фон Мелдзінген (*Johannes de Meldingen),* пабачыўшы такое войска, спаліў цалкам прадмесце. На трэці дзень язычнікі атакавалі замак, але хрысціяне, мужна абараняючыся, прымусілі іх адступіць. Пасля чаго кароль узгадніў з маршалам дзень перамоваў і адступіў, страціўшы там многіх" [14, s. 475].

Лаканічнасць і фрагментарнасць гэтага паведамлення тым не менш дазваляюць аднавіць тактычныя рэаліі гэтай літоўскай выправы.

Верагодна сам князь разам са сваім артылерыйскім паркам плыў на караблі па Нёмане, а асноўная маса літоўскага войска рухалася па беразе, як гэта практыкавалася ў падобных выправах [2, с. 23]. Наперад быў высланы авангард (ці таксама на караблях, ці конна), колькасць якога была больш за 60 ваяроў, на яго ж і прыйшоўся ўдар Яханэса фон Пфірта. Пасля гэтай сутычкі да замка падышоў асноўны атрад. Убачыўшы яго, комтур прыняў рашэнне пра бессэнсоўнасць абароны прадмесця і падпаліў яго. На падрыхтоўку аблогі і ўсталяванне бамбардаў літве вілдаць спатрэбіўся яшчэ адзін дзень, пасля чаго (трэба меркаваць, і пасля абстрэлу з бамбард) быў пачаты штурм. Аднак абаронцы вытрымалі націск. Як вынікае з далейшага кантэксту, пасля штурму да замка падаспеў Куна фон Хаттштайн з падмогай, гэта прымусіла Кейстута адступіць, папярэдне ўзгадніўшы дату наступных перамоваў.

У паходзе Кейстута на Юргенбург можна прасачыць некаторае тактычнае і лагістычнае падабенства з выправай Ордэна пад Наваполле. Войска як мінімум дзялілася на дзве часткі: авангард (задача якога была хутка атакаваць абраны замак і нанесці як мага больш шкоды) і асноўны атрад з артылерыяй. Апошняя, прынамсі да мяжы варожых тэрыторый, дастаўлялася найбольш зручным спосабам, тобок па рацэ. Пасля атакі авангарда на замак і падыхода асноўнага атрада, патрабаваўся прыкладна дзень для падрыхтоўкі аблогі.

Аблога Юргенберга з'яўляецца самым раннім сведчаннем выкарыстання літвой агнястрэльнай зброі. Звесткі пра дадзеную выправу на жаль адсутнічаюць у іншых крыніцах, аднак па меркаванні аўтара, яны ўсё ж такі вартыя даверу. У першую чаргу гэтаму спрыяе сам характар хронікі Віганда – храналагічная блізасць моманту яе стварэння (1391–1394 гг.) да апісаных падзей, і шырокая абазнанасць аўтара ў сферы ваенных кампаній на літоўска–ордэнскім памежжы [14, s. 39–40]. Наступны пераканаўчы фактар, гэта тое, што факт наяўнасці агнястрэльнай зброі ў літвы ўкладаецца ў агульную храналогію распаўсюджвання гэтага віду ўзбраення ў рэгіёне. Як адзначалася вышэй, у Ордэна яна з'явілася ўжо з сярэдзіны – другой паловы 70–х г., у Маскоўскім княстве артылерыя ўпершыню дакладна зафіксаваная ў тым жа 1382 г. [5, с. 62], а ў Польскім каралеўстве – у 1383 г. [12, s. 14; 13, s. 12].

Прыведзеная згадка, тым не менш, пакідае і шэраг пытанняў. Невядома колькі дакладна было гармат у Кейстута. Аднак тое, што яны былі дастаўленыя на адным караблі, наводзіць на думку, што іх было няшмат. Можна толькі меркаваць адкуль яны ўвогуле з'явіліся ў літоўскага князя. Пры спробе адказу на гэтае пытанне таксама варта ўлічваць, што "ў камплекце" з артылерыяй павінны былі ісці артылерысты, порах і боепрыпасы. З самых відавочных варыянтаў: гэта магла быць закупка гатовай зброі, альбо яе вытворчасць у ВКЛ. Тэарэтычна таксама гэта мог быць і захоп трафейнай артылерыі ў адным з замкаў узятых літвой (з магчымым паланеннем адпаведных спецыялістаў). Хаця апошні варыянт падаецца найменш верагодным. У перыяд з 1374 г., калі гарматы былі зафіксаваны ў арсенале Лейпе, і да моманту іх першага выкарыстання Кейстутам у 1382

Рэпазіторый ВГУ

г. літоўскае войска брала некалькі цвярдыняў: летам 1376 г. у выніку хуткага наскока былі падпаленыя, а потым узятыя Таплакі (*Tapilauken/Taplaken*) [14, s. 388–391; 11, s. 100; 7; верагодна пра гэты ж паход: 10, s. 110–111; 6, с. 129]; у 1378 ці 1379 гг., як сведчыць Віганд, падобным жа чынам быў узяты замак Акартова (*Eckersberg) [*14, s. 435–437]; у красавіку 1379 г., па сведчанні "Торнскіх аналаў", быў узяты замак Астраланкен (*Osterlankcn) [*11, s. 110; 7]; у траўні 1379 г. быў здзейснены напад на Мемель, які таксама па выніку быў спалены (хоць абаронцам верагодна і ўдалося адступіць) [11, s. 110–111; 7; 14, s. 422–423]. Аднак ні ў адной з пералічаных цвярдынь у гэты перыяд наяўныя крыніцы, не фіксуюць артылерыю (напрыклад у Мемелі яна з'яўляецца толькі ў 1389 г.) [8, s. 6–8]. Таксама варта згадаць, што летам 1381 г. Кейстутам была захопленая Вільня і паланёны Ягайла [11, s. 117–118; 7; 14, s. 476–477]. Аднак, калі Кейстут здабыў артылерыю там, то адкрытым застаецца пытанне адкуль яна з'явілася ў Ягайлы?

**Падсумаванне.**

Падводзячы вынікі можна адзначыць, што агулам, першы вопыт выкарыстання артылерыі на літоўска-ордэнскім памежжы выглядае досыць неадназначным. Дэ-факта, у выніку першага ордэнскага паходу, дзе дакладна прысутнічалі гарматы, былі знішчаныя два літоўскія замкі. Аднак роля бамбард у гэтым знішчэнні была хутчэй маральна-псіхалагічная – абаронцы Напаполля былі ўражаныя самім фактам іх прымянення (пры гэтым невядома нават якія разбурэнні імі былі нанесены), а ў Дарсунішках хутчэй уразіліся незайздросным лёсам сваіх суседзяў, і атрада які ішоў ім на дапамогу. Падобнае ж неадназначнае ўражанне пакідае і ўдзел артылерыі ў выправе Кейстута. Наўрадці абстрэл Юргенбурга быў досыць эфектыўны, калі штурм быў адбіты абаронцамі. Аднак невядома як скончыліся б наступныя атакі, каб да замка не падышоў Куна фон Хаттштайн са сваім атрадам. Такім чынам пытанне эфектыўнасці прымянення артылерыі ў згаданых ваенных акцыях застаецца пакуль адкрытым.

Тое ж можна сказаць і пра пытанні колькасці гармат, месцах іх базавання і крыніцы паступлення. Для Ордэна тут можна высунуць хаця б нейкія тэзы, абапіраючыся на інфармацыю з захаваўшыхся інвентароў замкаў: калі гарматы пад сцены Наваполля былі прывезеныя з Рагнеты, то іх колькасць наўрад ці перавышала 6 ці 7 адзінак, аднак, адкуль яны ўзяліся ў Рагнеце застаецца таксама невядомым. Артылерыйскі ж парк літоўскага войска можна акрэсліць толькі абстрактна: ён быў невялікі і напэўна меншы, чым ордэнскі.

У той жа час, калі разглядаць артылерыю агулам як ваенную інавацыю, то досыць верагодна, што ў ВКЛ яе ўспрынялі менавіта ад Тэўтонскага ордэна. Менавіта яму належыць храналагічнае першынство сярод суседзяў ВКЛ у авалодванні гэтым відам узбраення. У той жа час, наўрадці б прысутнасць агнястрэльнай зброі ў ордэнскіх арсеналах магла быць схаваная ад пільнага вока літоўскіх князёў за перыяд з 1374 па 1381 гг. Да актыўнай узаемнай выведкі і своеасаблівай "гонкі ўзбраенняў" падштурхоўвала сама логіка перманентнай вайны ў якой існавалі дзве дзяржавы на працягу дзесяцігоддзяў. Спрыяць жа гэтай выведцы магла вялікая колькасць перабежчыкаў і палонных, а таксама кантакты і абмен баявым вопытам у межах рыцарскай культуры тагачасных ваенных эліт. Сам характар вайны, якая набыла на той момант зацяжны характар, патрабаваў ад варагуючых бакоў пошуку ўніверсальнай "адмычкі" ад варожых цвярдынь, якой і магла стаць артылерыя. Напрыклад, як мы бачылі вышэй, з 1374 па 1381 гг. літва брала замкі ў асноўным ці наскокам ці хітрасцю, і такая сітуацыя цягнулася яшчэ з канца папярэдняга стагоддзя [2, с. 22]. У гэтым рэчышчы досыць лагічнымі выглядаюць апісаныя аблогі Наупілена і Юргенбога – такія блізкія па часе і падобныя па сваіх абставінах. Невядома наколькі доўга да 1382 г. літоўскія князі маглі валодаць артылерыяй, але верагодна, што паспяховае яе прымяненне Ордэнам у 1381 г. падштурхнула Кейстута да сіметрычнага адказу свайму пастаяннаму ваеннаму суперніку.

Такім чынам, лакалізацыя і блізасць па часе пачатку выкарыстання артылерыі ў наступальных мэтах, ускосна, але не двухсэнсоўна могуць указваць на тое, што агнястрэльная зброя як ваенная інавацыя ў ВКЛ была запазычаная ад Тэўтонскага ордэна.

Сярод пералічаных ваенна-гістарычных асаблівасцей аблогі Юргенбурга войскамі ВКЛ, можна вылучыць і адну ваенна-патрыятычную: ад першай паловы красавіка 1382 г., як ад першай зафіксаванай даты баявога прымянення гармат, можна адлічваць гісторыю артылерыі Вялікага Княства Літоўскага, а значыць і гісторыю артылерыі Узброеных Сілаў Рэспублікі Беларусь.


1. Вилинбахов, В. Б. Новый факт знакомства Руси с огнестрельным оружием / В. Б. Вилинбахов, М. Ф. Мурьянов // Вопросы истории. – 1960. – № 8. – С. 218–219.
2. Гагуа, Р. Б. Характер военных действий на прусско-литовском пограничье на рубеже XIII-XIV столетий / Р. Б. Гагуа // Веснік Палескага дзяржаўнага універсітэта. Серыя грамадскіх і гуманітарных навук: научно-практический журнал. – 2014. – № 2. – С. 22–24.
3. Зімніцкі, А. А. Да пытання наяўнасці агнястрэльнай зброі ў войскаў Тэўтонскага Ордэна падчас аблогі Коўна ў 1362 г. / А. А. Зімніцкі // Беларускі гістарычны часопіс. – 2020. – № 1 (246) – С.9–18.


Рэпазіторый ВДУ

4. Зімніцкі, А. А. Першыя факты (?) выкарыстання Тэўтонскім ордэнам агнястрэльнай зброі супраць войскаў Вялікага Княства Літоўскага. Па матэрыялах хронікі Мацея Стрыйкоўскага. / А. А. Зімніцкі // Studia historica Europae Orientalis = Исследования по истории Восточной Европы : науч. сб. – Вып. 12. – Минск : РИВШ, 2019. – С. 42–62.
5. Кирпичников, А. Н. Военное дело на Руси в XIII-XV вв. / А. Н. Кирпичников. – Москва : Наука, 1976. – 104с.
6. Ливонская хроника Германа Вартберга / Сборник материалов и статей по истории Прибалтийского края; составитель Е. В. Чешихин-Ветринский. – Рига, 1879. –Т. II. – С. 81–133.
7. Торнский анналист [Электронны рэсурс] // Восточная Литература. Средневековые исторические источники Востока и Запада. – Рэжым доступу: http://www.vostlit.info/Texts/rus17/Ann_Thorun/frametext.htm. – Дата доступу: 30.03.2021.
8. Rathgen, B. Die Pulverwaffe im Deutschordensstaate von 1362 bis 1450 / B. Rathgen // Elbinger Jahrbuch – 1922. – T. 2. – S. 1–116.
9. Schmidtchen, V. Die Feuerwaffen des Deutschen Ritterordens bis zur Schlacht bei Tannenberg 1410: Bestände, Funktion und Kosten, dargestellt anhand der Wirtschaftsbücher des Ordens von 1374 bis 1410 / V. Schmidtchen. – Lüneburg : Nordostdeutsches Kulturwerk, 1977. – 93 s.
10. Scriptores rerum Prussicaruin / Hrsg. von T. Hirsch, M. Töppen und E. Strehlke. – Bd. 2. – Leipzig, 1863. – 866 s.
11. Scriptores rerum Prussicarum / Hrsg. von T. Hirsch, M. Töppen und E. Strehlke. – Bd. 3. – Leipzig, 1866. – 730 s.
12. Strzyż, P. Broń palna w Europie Środkowej w XIV-XV w. / P. Strzyż. – Łódź : Instytut Archeologii i Etnologii PAN. Ośrodek Badań nad Dawnymi Technologiami, 2014. – 407 s.
13. Szymczak, J. Początki broni palnej w Polsce 1383–1533 / J. Szymczak. – Łódź, 2004. – 424 s.
14. Wigand von Marburg. Nowa kronika pruska / oprac. S. Zonenberg, K. Kwiatkowski. – Toruń : TNT, 2017. – 667 s.

**Лицкевич О. В.**

## ГРАНИЦА МЕЖДУ ВКЛ И ЛИВОНИЕЙ ОТ ОЗЕРА КУРЦУМА ДО ЗАПАДНОЙ ДВИНЫ В XIV–XV ВВ.

В XIV–XVI вв. поле близ озера Курцума, лежащего к востоку от современного литовского города Зарасай, традиционно служило местом проведения литовско-ливонских переговоров и отправной точкой, с которой начиналась демаркация границы между ВКЛ и Ливонией [19, s. 249–253; 5, c. 42]. Отсюда двусторонние комиссии обозначали границу как в западном направлении – до Балтийского моря, так и в восточном – до Западной Двины и дальше в направлении псковского рубежа. Примыкающий к оз. Курцума край издревле занимал приграничное положение на стыке между Полоцкой землей, Литвой, Селонией и Латгалией, а около 1254 г. к озеру с северо-запада вплотную приблизился рубеж территорий, контролируемых Тевтонским орденом в Ливонии [14, col. 361, № 269]. Кроме того, мимо оз. Курцума пролегал сухопутный торговый путь из Литвы в Латгалию, который выходил к Зап. Двине в районе городища Новене (Вецпилс), где в 70-х гг. XIII в. Орден воздвиг замок Динабург [17, s. 48]. В орденском фальсификате грамоты Миндовга 1261 г. этот торговый путь назван Korpwech [3, c. 41, 43]. Вот почему корни этого обычая (проводить переговоры на оз. Курцума) могут восходить еще ко временам великого князя Тройденя, который примерно в 1281 г. в результате сделки с Орденом более чем на 30 лет взял область вокруг Динабурга под контроль ВКЛ [об этих событиях: 12, p. 140–142].

В XIV в. ВКЛ и Тевтонский орден в Ливонии заключали между собой так называемые «договоры о разбойниках» (лат. «pax latrunculorum»; нем. «struter frede»). Два таких договора были заключены в правление Гедимина: один под неизвестной датой («старый мир»), другой в 1338 г. [4, c. 66–69], и еще два в правление Ольгерда: один около 1367 г. («мир Стирпейки») и другой 7 ноября 1367 г. [1, c. 104–107]. Еще один «договор о разбойниках» с Тевтонским орденом в Ливонии заключил князь Скиргайло Ольгердович в январе 1390 г. [1, c. 65]. Называемые в «договорах о разбойниках» местности обозначают не собственно *границу*, а, как показал Стивен Роуэлл на примере договора 1338 г., мирные зоны, в которых стороны гарантировали безопасный проезд купцам [16, p. 79, 257, map 3].

Первая известная нам демаркация литовско-ливонской границы была проведена в 50-х или 60-х гг. XIV в. Со стороны ВКЛ процедурой руководил упитский наместник Войшвилт († 1370) [19, s. 244; 11, s. 93], поэтому в источниках XV–XVI вв. эта граница называется **Войшвилтовой.** О ее конфигурации можно судить лишь по отрывочным данным. В частности, она проходила по р. Сусее, правому притоку р. Мемеле, и в районе, где впоследствии был построен ливонский замок Бауска [19, s. 243–245; 11, s. 94; 6, p. 179–180]. Из договора между ВКЛ и Тевтонским орденом в Ливонии 1473 г. можно понять, что Войшвилтова граница начиналась от оз. Курцума в обе стороны и доходила на западе до самого Балтийского моря, а на востоке до Западной Двины [11, s. 102]. Нет никаких прямых данных о том, что ливонская сторона признавала эту демаркацию. Однако в Мельнском договоре 1422 г. оговаривается, что граница ВКЛ с Ливонией должна идти не по той линии, которая была установлена, когда Орден владел Жемайтией, а по еще более старому рубежу [10, s. 5]. Здесь имеется в виду какая-то граница, проведенная еще до 1382 г. (когда был заключен первый договор об уступке Ордену западных волостей Жемайтии), и речь может идти только о Войшвилтовой границе.

После того как ВКЛ в 1313 г. утратило контроль над Динабургом и прилегающей к нему областью [17, s. 56], вопрос об отрезке границы между оз. Курцума и Западной Двиной с новой остротой встал в 80-х гг. XIV в. в связи с событиями в Полоцкой земле. В 1381 г., осаждая Полоцк, чтобы стать полоцким князем, Скиргайло пообещал ливонскому ландмистру в обмен на военную помощь передать в вечное владение небольшую территорию (terriculam) [17, s. 607]. Вероятно, речь шла о



Репозиторий ВГУ